# Як адраджаецца Ельня

**Высокі статус заказніка**

Назва “Ельня” аб’ядноувае два буйныя прыродныя аб’екты, якія знаходзяцца на Віцебшчыне. Першы — само балота Ельня, або Вялікі Мох, як раней называлі гэтую ўнікальную мясціну жыхары навакольных паселішчаў, ды й цяпер называюць старажылы.

Плошча Ельні — звыш 20 тысяч гектараў, узрост — болын за 9 тысяч гадоў. Тэта адно з найбуйнейшых вер- хавых балотаў Беларусі і ўсёй кантынентальнай Еўропы. Велізарны, надзвычай разнастайны балотна-азёрны комплекс у апошнія гады вабіць да сябе вучоных і спецы- ялістаў, якія займаюцца праблемамі аховы навакольнага асяроддзя. І нездарма. Балота проста насычана флорай і фаўнай. Адных толькі птушак, якія ахоўваюцца, тут гняз- дуецца 23 віды. А лепшага месца для адпачынку шэрых журавоў у іх доўгім і небяспечным падарожжы ў вырай не варта і шукаць.

У лістападзе 1968 года быў створаны дзяржаўны гідра- лагічны заказнік рэспубліканскага значэння “Ельня”. Напачатку яго межы супадалі з вышэй згаданым балртам. У снежні 2007 года ён быў пераўтвораны ў рэспубЛіканскі ландшафтны заказнік, удакладнены яго межы і гілоііча. За- казнік размешчаны на тэрыторыі Міёрскага і ІІІаркаў- шчынскага раёнаў і займае плошчу ў 25,3 тыс. га. Мае ён і міжнародны прыродаахоўны статус — з 2002 года з’яўляецца Рамсарскай тэрыторыяй. Тут знаходзяцца болын за 100 азёр. І яшчэ адзін надзвычай цікавы факт: “Ельня” — гэга 475 мільёнаў кубічных меграў чысцюткай прэснай вады, болын яе толькі ў нашай знакамітай Нарачы.

**“Да птушак — з любоўю”**

Кожную восень над абшарамі гэтага краю ляцяць журавы. Птушкі, якія мігрыруюць са Скандынавіі і поўначы Расіі праз Беларусь у цёплыя краіны на зімоўку, робяць тут доўгі, на два-тры тыдні, прыпынак, каб падсілкавацца і адпачыць.

Якраз у такую залатую асеннюю пару на балоце паспяваюць журавіны — любімы ласунак журавоў. У іх гонар ужо некалькі гадоў запар тут праходзіць унікальны экалагічны фестываль “Жураўлі і журавіны Міёрскага краю”. Ён стартаваў у рамках праекту Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН “Садзейнічанне развіццю ўсёабдымнай структуры міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь”. Нацыянальным выканаўчым агенцтвам праекту выступала Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Аргайізатарамі фестывалю таксама з’яўляюцца Міёрскі райвыканкам, дзяржаўная прырода- ахоўная ўстанова “Ельня” пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму, грамадскай арганізацыі “Ахова птушак Бацькаўшчыны”, унітарнага прадпрыемства “Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь”.

У праграме мерапрыемства заўсёды цікавыя конкурсы для дарослых і дзяцей, дэгустацыя журавінавага морсу, выпечкі з журавінамі і саміх ягад — свежанькіх, толькі што з балота. На завяршэнне — выступленні мясцовых фальклорных і дзіцячых калектываў, работа выставы-продажу вырабаў народных умельцаў і іншае.

Самае ж цікавае на фестывалі — назіранне за журавамі. Зранку птушкі разлятаюцца па навакольных палях у ра- дыусе 20-30 кіламетраў ад балота і там увесь дзень харчуюцца. А для пачлегу ім патрэбна вельмі спакойнае месца. І лепшага, чым Ельня, тут няма. Калі птушкі пачынаюць вяртацца на балота, за імі добра назіраць і нават лічыць.

— Фестывалі — лепшая форма папулярызацыі ўсяго найбольш значнага, цікавага і прышжага, што ёсць у нашым раёне, што падорана нам прыродай, здабыта і шануецца на- шымі руплівымі і таленавітымі жыхарамі, — упэўнены старшыня Міёрскага райвыканкама Ігар Кузняцоў.

**На карысць прыродзе**

Многія называюць Ельню лёгкімі Еўропы. І вельмі хочацца, каб гэтыя лёгкія

былі чыстымі. Як жа захаваць першапачатковую природную прцігажосць Ельні, яе не- паўторны каларыт і адначасова дапамагчы развіццю Міёрскага краю?

Летась на конкурсе Еўрапейскай камісіі Міёрскі райвыканкам выйграў грант на мільён еўра. Праект накірава- ны на ўстойлівае развіццё рэгіёну праз партнёрства мяс- цовай улады і грамадскасці. Частка грашовай сумы праекту будзе выкарыстана і на адраджэнне Ельні, у тым ліку захаванне яе біялагічнай разнастайнасці.

— За апошнія 12 гадоў наш заказнік набыў вялікі вопыт супрацоўніцтва з грамадскімі і міжнароднымі эка- лагічнымі арганізацыямі, а таксама з прадпрыемствамі, якія гатовы фінансаваць экалагічныя праграмы, — раска- заў дырэктар ДПУ Іван Барок. — Так, супрацоўніцтва з АІІБ доўжыцца са дня стварэння заказніка. У 2007 годзе пачаліся сумесныя работы па будаўніцтве плацін на канавах у цэнтры балота. Сіламі валанцёраў з 2007 па 2009 год узведзена каля 40 такіх збудаванняў. З нершага валанцёр- скага лагера на Ельні ўжо адбылося болын за 20 надобных акцый. Такія лагеры праводзіліся ў рамках праекту “Выратуем Ельню разам!”. Ён стаў ужо традыцыйным і фінансуецца ўнітарным прадпрыемствам “Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь”. Дарэчы, гэта кампанія неаднаразова пад- трымлівала фестываль “Жураўлі і журавіны Міёрскага краю”. А ў 2016 годзе пры яе фінансаванні была праведзена маштабная акцыя па ўборцы і вывазе смецця з аддаленых астравоў заказ ніка.

У 2016 годзе ў рамках праекту ПРААН/ГЭФ “Тар- фянікі-2” пабудаваны 48 гідраплацін на дрэніруючых ва- датоках і пяць гацей для праезду спецыяльнай тэхнікі. У вёсцы Буды з’явілася экалагічная сцежка “Прырода род- нага краю” даўжынёй 2,5 км.

З дапамогай праекту ЕС/ПРААН “Садзейнічанне раз- віццю ўсёабдымнай структуры міжнароднага супрацоўніц- тва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь” у 2011-2014 гадах забяспечана матэрыяльна-тэх- нічная база заказніка, распрацавана канцэпцыя яго ўстой- лівага развіцця, адрамантаваны і аснашчаны экалагічны ві- зіт-цэнтр, пабудавана экалагічная сцсжка “Азяраўкі-Ель- ня”. Былі таксама распрацаваны турыстычныя прадукты, спецыялісты заказніка і іншых зацікаўлсных арганізацый прайшлі навучанне па развіцці экатурызму ў рэгіёне.

**Добрыя справы аб’ядноўваюць**

Сярод галоўных кірункаў дзейнасці заказніка Іван Барок вылучае развіццё валанцёрства.

— Неабходна шырэй прыцягваць валанцёраў, прадстаўнікоў зацікаўленай грамадскасці да ўдзелу ў вырашэнні задач па зберажэнні біяразнастайнасці і ўстойлівым выкары- станні прыродных рэсурсаў, — упэўнены ён. — З 2009 года заказнік сумесна з АПБ стварыў сетку ахоўнікаў важных прыродных тэрыторый Ельні. Яна дзейнічае і цяпер і аб’ядноўвас валанцёраў з усёй краіны.

Актыўна падтрымліваюць ініцыятывы і жыхары Міёрскага і ІПаркаўшынскага раёнаў. Па словах дырэктара заказніка, дзякуючы пастаяннай і карпатлівай працы калек- тыву заказніка і дзелавых партнёраў, узровень экалагічнай свядомасці мясцовага насельніцтва ўзрос.

Любяць Ельню і турысты — як беларускія, так і замеж- ныя. Прыязджаюць сюды і прадсгаўнікі батанічных садоў ЗША, Расіі, Казахстана. З кожным годам колькасць наведвальнікаў гэтай унікальнай тэрыторыі расце.

Міхаіл ШЫМАНСКІ

**Источник:** Родная прырода. – 2020. – № 2. – С. 8–9.